БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ
ГЕОГРАФИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

# ДЕМОГРАФИЧЕСКИЕ РИСКИ XXI века

## (к Международному дню народонаселения)

**Тезисы докладов**
**V межвузовской студенческой конференции**
**с международным участием**

**Беларусь, Минск**
**18 мая 2018 г.**

МИНСК
БГУ
2018

УДК 314(06)+33:911.3(06)+338.48(06)

Р е д а к ц и о н н а я  к о л л е г и я:
зав. кафедрой экономической и социальной географии
доктор географических наук, профессор *Е. А. Антипова* (гл. ред.);
аспирант кафедры экономической и социальной географии
*Л. О. Жигальская* (отв. секретарь)

Р е ц е н з е н т ы:
доктор географических наук, профессор *К. К. Красовский*
(УО «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина»);
кандидат географических наук, доцент *В. М. Зайцев*
(Белорусский государственный университет)

**Демографические** риски XXI века (к Международному дню народонаселения) [Электронный ресурс] : тез. докл. V межвуз. студенческой конф. с междунар. участием, Беларусь, Минск, 18 мая 2018 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Е. А. Антипова (гл. ред.), Л. О. Жигальская (отв. секретарь). – Минск : БГУ, 2018.
ISBN 978-985-566-560-2.

В издании представлены научно-методические и практические результаты научных исследований в области современных проблем географической науки, демографических рисков и социально-экономического развития стран и регионов мира проблем развития туризма и геоэкологии.

Адресуется преподавателям, научным работникам, студентам и аспирантам вузов.

**УДК 314(06)+33:911.3(06)+338.48(06)**

**ISBN 978-985-566-560-2**
© БГУ, 2018

# РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПРАМЫСЛОВАЯ ПАЛІТЫКА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ У СУЧАСНЫ ПЕРЫЯД

*Запрудскі І.І.*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск
E-mail: Albarutenicageo@gmail.com

Любая краіна ў свеце імкнецца да прасторавай аптымізацыі свайго гаспадарчага комплексу, што патрабуе ад дзяржавы правядзення рацыянальнай рэгіянальнай прамысловай палітыкі. На нашу думку, рэгіянальная прамысловая палітыка сваей галоўнай мэтай павінна ставіць эфектыўнае развіцце прамысловай вытворчасці ў рэгіенах, накіраванае на паляпшэнне ўмоў распаўсюджвання інавацый у прасторы і стварэнне спрыяльнага клімату для развіцця малога і сярэдняга бізнэсу, што будзе ў цэлым абумоўліваць інтэнсіўнае развіцце прамысловасці ў краіне, накіраванае на вытворчасць канкурэнтаздольнай прадукцыі на знешніх і ўнутранным рынках. Значыць, рэгіянальная палітыка не павінна супярэчыць дзяржаўнай прамысловай палітыцы, а, наадварот, спрыяць дасягненню яе мэтаў і задач, што патрабуе ўзгаднення дзеянняў паміж рэгіянальнымі і дзяржаўнымі органамі ўлады для стварэння цэласнай сістэмы дзяржаўнага рэгулявання.

У Рэспубліцы Беларусь уласна адсутнічае дакумент, які рэгулюе прамысловае развіцце рэгіенаў. Аднакасноўныя захады рэгіянальнай прамысловай палітыкі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе акрэслены ў наступных праграмных дакументах: Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г.; Асноўныя палажэнні стратэгій развіцця і размяшчэння вытворчых сіл рэгіенаў Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г.; Праграма развіцця прамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г.; Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг.; Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гады; Нацыянальная праграма развіцця экспарта Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг.

Аналізуючы змест праграм, іх мэты, задачы і механізмы рэалізацыі можна прыйсці да высновы, што яны напісаны на высокім даследчым узроўні з улікам наяўнай сітуацыі, якая складваецца ў эканоміцы краіны. Аднак, як адзначае В. У. Дамакур, дасягнуць мэтаў дзвюм апошнім праграмам за вызначаныя тэрміны не атрымалася, што звязана з адсутнасцю механізмаў комплекснага аналізу іх выканання [1]. З пункту

гледжання сучасных падыходаў у эканамічнай геаграфіі і рэгіянальнай эканомікі да галоўных недахопаў акрэсленых праграмналежыць аднесці:

1. Слабы ўлік фактару «прасторы» і яго ўплыву на сацыяльна-эканамічнае развіцце рэгіенаў, на што яшчэ звяртаў увагу стваральнік «новай эканамічнай геаграфіі» П. Кругман [2]. Тэрыторыю краіны і яе рэгіенаў нельга ацэньваць толькі з пазіцыі яе рэсурсных магчымасцей і паказчыкаў плошчы. Падыход з мэтай атрымання хуткай аддачы ад прыцягнутых інвестыцый не дазваляе сістэмна развіваць рэгіянальную эканоміку, таму неабходна пры рэалізацыі прамысловай палітыкі ўлічваць такія фактары, як эфект маштабу пры канцэнтрацыі вытворчасці і транспартныя выдаткі. Таксама нельга забываць пра неабходнасць правядзення комплекснай ацэнкі эканоміка-геаграфічнага становішча тэрыторый, якое можа накладваць пэўныя абмежаванні або даваць дадатковыя імпульсы да ўстойлівага развіцця рэгіенаў.

2. Пераважны аналіз механізмаў і падыходаў у прамысловай палітыцы, якія дэкларуюць рост (дасягненне сярэднееўрапейскага ўзроўню па некаторых паказчыках), а не развіцце прамысловай вытворчасці. Свет знаходзіцца на мяжы пераходу да VI цыклу Кандрацьева, для якога характэрны новыя формы арганізацыі вытворчасці і прапульсіўныя віды эканамічнай дзейнасці ў прамысловасці (нана- і біятэхналогіі, альтэрнатыўная энергетыка, тонкая хімія і г. д.). Таксама неабходна ўлічваць, што ў высокаразвітых краінах прасочваецца тэндэнцыя да неаіндустрыялізацыі, інтэнсіўнай робатызацыі вытворчасці са стварэннем «Індустрыі – 4.0». Таму для даганяючага развіцця неабходна фіксаваць усе сучасныя тэндэнцыі, якія адбываюцца ў перадавых краінах, і ўлічваць пры планаванні прамысловай палітыкі пазітыўны і негатыўны вопыт замежных краін. Гэта неабходна па прычыне рызыкі канчаткова адстаць ад высокаразвітых дзяржаў Заходняй Еўропы, Паўночнай Амерыкі, Усходняй Азіі, што можа прывесці да страты сваей прамысловасці і індустрыяльнага аблічча краіны ў міжнародным геаграфічным падзеле працы.

3. Малая ўвага да прамысловага і інавацыйнага развіцця рэгіенаў і іх месца ва ўнутрыдзяржаўным геаграфічным падзеле працы. Адмаўленне ад сістэмы цэнтралізаванага планавання і адміністратыўна-каманднага кіравання і пераход да сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі прывеў да ўзмацнення рэгіяналізацыі краіны. Яна таксама праяўляецца ў тэрытарыяльнай канкурэнцыі паміж рэгіенамі, што патрабуе стварэння сваей праграмы прамысловага развіцця для кожнага з іх. Таму ўсе разгледжаныя праграмы маюць адзін істотны недахоп – яны не

выходзяць пры складанні пэўных рэкамендацый на ўзровень мікрарэгіенаў (адміністратыўных раенаў і гарадоў абласнога падпарадкавання). Напрыклад, у Праграме развіцця прамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. прысутнічае раздзел, які прысвечаны развіццю прамысловага комплексу ў рэгіенах. У ім дэкларуецца, што галоўнай мэтай рэгіянальнай прамысловай палітыкі з'яўляецца змяншэнне дысбалансу ў эканамічным развіцці паміж індустрыяльнымі цэнтрамі і малымі і сярэднімі гарадскімі пасяленнямі. Названая мэта больш адпавядае задачам сацыяльнай палітыкі. Сучасныя падыходы да рэгіянальнай палітыкі сведчаць, што рэгіянальнае развіцце не можа быць раўнамерным. З гэтага вынікае, што дзяржаве наадварот неабходна падтрымліваць развіцце эканамічнага цэнтра, што ў выніку прасторавай дыфузіі інавацый будзе станоўча ўплываць на развіцце перыферыі. Таксама для дасягнення пастаўленай мэты ў праграме была прапанавана задача па размяшчэнню і развіццю ў малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях навукаваемістых вытворчасцей, што супярэчыць галоўным фактарам размяшчэння вытворчасці ў населеных пунктах такога тыпу.

Такім чынам, неабходна адзначыць, што ў краіне адбываецца фарміраванне сучасных прынцыпаў і падыходаў да рэгіянальнай прамысловай палітыкі. Пры гэтым назіраецца пэўнае замаруджанае рэагаванне дзяржаўнага кіраўніцтва на змены ў кан'юнктуры ва ўнутранным і знешніх рынках, што тлумачыцца слабой сувяззю праграмных дакументаў з тэарэтычнымі і практычнымі дасягненнямі эканамічнай геаграфіі, а таксама падыходамі да цыклічнага характару развіцця сусветнай гаспадаркі і асноўнымі следствамі крызісных праяў у капіталістычных эканоміках. Праведзенае даследаванне выявіла некаторыя разыходжанні паміж праграмамі ў канцэпцыях прамысловай палітыкі, а таксама істотныя адрозненні ў прамысловым развіцці рэгіенаў, што абумоўлівае аб'ектыўнасць неабходнасці ўдасканалення рэгіянальнай прамысловай палітыкі для вырашэння праблем, якія маюць агульнарэспубліканскую значнасць і не могуць быць пераадолены намаганнямі саміх рэгіенаў.

**Літаратура**

1. Домакур, О.В. Приоритеты промышленной политики Республики Беларусь в свете закономерностей структурной трансформации и формирования постиндустриального общества [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://vestnik.vstu.by/files/6213/6326/7921/UDK_338.45.01_330.341.42_330.342.1.pdf. – Дата доступа: 19.08.2017

2. Krugman, P. Geography and Trade / P. Krugman. – Cambridge; MIT Press, 1991. – 156 p.